*УДК 821.161.3-311.3*

**Я. М. Батурына**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ФАНТАСТЫЧНЫ ЭЛЕМЕНТ У БЕЛАРУСКАЙ РАБІНЗАНАДЗЕ

*Мэтай дадзенага даследавання з‘яўляецца вызначэнне мастацкай спецыфікі беларускай рабінзанады з фантастычнымі элементамі. На прыкладзе твораў «Цунамі» А. Куляшова і «Апошняя пастараль» А. Адамовіча аўтар разглядае прыкметы сюжэтнай схемы рабінзанады і прыходзіць да высновы пра арыгінальнасць жанравай спецыфікі згаданых твораў, якія спалучаюць рысы антыўтапічнага жанру, постапакаліптыкі і прыпавесці з уласцівымі рабінзанадзе адметнасцямі.*

Сюжэтная схема рабінзанады бярэ пачатак ад рамана англійскага пісьменніка Даніэля Дэфо «Рабінзон Круза», які быў упершыню апублікаваны ў 1719 годзе і амаль адразу стаў літаратурнай сенсацыяй. Прычым тэрмін «рабінзанада» замацаваўся ў гуманітарнай навуцы амаль імгенна: упершыню яго ўжыў нямецкі пісьменнік І. Т. Шнабель, выкарыстаўшы ў прадмове да сваѐй утопіі ‒Выспа Фельзенбург‖, выдадзенай у 1731 годзе.

Будучы блізкай да раманаў авантурна-прыгодніцкага тыпу, складаючы як бы асобны від гэтага кшталту твораў, рабінзанада мае сваю адметную сюжэтную схему. Калі авантурна-прыгодніцкі раман будуецца на вострых канфліктах паміж людзьмі, то рабінзанада мае сваім сюжэтным стрыжнем сутыкненне адасобленага чалавека з супрацьпастаўленай яму прыроднай стыхіяй, складаную барацьбу героя-адзіночкі за ўласнае выжыванне, што падпарадкавана адзінай мэце – імкненню вярнуцца дадому, у цывілізацыю і грамадства.

Папулярнасць рабінзанады, якая дасягнула свайго апагею ў эпоху Асветніцтва, не надта зменшылася і ў XX–XXI стагоддзях. Так, Т. Ружэвіч зазначае: «Сучасныя пісьменнікі таксама ствараюць рабінзанады» [1, с. 16]. Прычым у айчынным мастацтве слова рабінзанада нярэдка набывае адметныя рысы, мадыфікуецца. У слушнасці гэтага выказвання мы можам пераканацца, прааналізаваўшы творы беларускай літаратуры мінулага стагоддзя «Цунамі» (1968) Аркадзя Куляшова і «Апошняя пастараль» (1987) Алеся Адамовіча.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Цунамі» – гэта філасофская паэма-перасцярога, у якой А. Куляшоў спрабуе вызначыць сутнасць чалавечага быцця, а таксама паказаць перспектывы развіцця чалавецтва і яго страх перад ядзернай катастрофай. Менавіта таму ў паэму пісьменнік уводзіць фантастычны элемент, праз гэты прыём ѐн паказвае будучыню нашай цывілізацыі з ужо на той момант існуючай і ўжытай ядзернай зброяй супраць чалавека, а не толькі ў эксперыментальных мэтах. Паэма «Цунамі» – гэта прарочае прадбачанне неразумнага выкарыстання грамадствам дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Дваццатае стагоддзе паказала, што канфлікты паміж краінамі ўжо не могуць быць лакальнымі і закранаюць увесь чалавечы род, а таму праблема, узнятая ў творы А. Куляшовым, актуальная і ў наш час.

Фантастычнае ў творы прадстаўлена ў выглядзе прагнастычнага пытання «А што можа быць, калі...?». Магчымая будучыня чалавечай цывілізацыі ў паэме канкрэтызавана праз лѐс двух закаханых, якія жадаюць схавацца ад грамадства, ад палітыкі і канфліктаў. У сучасным соцыуме паўстала вострае пытанне: як чалавеку самаадасобіцца ў нястрымным развіцці тэхналогій, як выратавацца ад ціску інфармацыйнага руху? Невырашальнасць гэтай праблемы ўнутры грамадства адчулі на ўласным прыкладзе героі А. Куляшова, і, жадаючы самаізалявацца ад зямных праблем, пакінулі чалавечую супольнасць, перарвалі з ѐю ўсе сувязі.

Твор мае выразныя прыкметы рабінзанады, і найперш – знаходжанне герояў у дзікіх прыродных умовах, іх жыццѐ па-за грамадствам, на самоце. Адзінота тут, аднак, не пакутлівая, не вымушаная, гэта – вынік свядомага выбару герояў. Твор, на здзіўленне, утрымлівае і прамыя адсылкі да першаадкрывальніка жанру – Д. Дэфо са сваім знакамітым «Рабінзонам Круза»:

Сон цуды з чалавекам робіць сонным.
Жанчына стала Пятніцай. А ѐн–
Быў мараком, прачнуўся Рабінзонам.
Як свет змяніўся за кароткі сон! [2, с. 290]

Уцѐкі герояў ад грамадства – гэта адмаўленне ад дасягненняў і наступстваў тэхнічнага прагрэсу, імкненне да яднання з прыродай. Адзінота паказваецца ў паэме як жаданне самазахавацца, адысці ад глабальных і дробных праблем, паразважаць аб жыцці, яго мэце і сэнсе. Як бачым, у паэме беларускага мастака слова знайшла ўвасабленне вельмі актуальная і сѐння філасофская праблема. І ў гэтым своеадметнасць куляшоўскай рабінзанады: паэт узняў не



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праблему выжывання чалавека ў адзіночку без інструментаў і сродкаў у змаганні з прыроднымі стыхіямі, як тое было ў класічных узорах жанру, а барацьбу з тэхнічным прагрэсам і глабалізацыяй. У гэтым мы бачым новую асаблівасць беларускай рабінзанады, новы канфлікт у гэтай сюжэтнай мадэлі: чалавецтва супраць навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Аднак самаадасабленне, згодна з паэтам, не можа працягвацца вечна, чалавек усе роўна вернецца ў цывілізацыю і грамадства:

…Ад клопатаў сваіх,
Той свет, які нядаўна караблѐм знік
За далягляд, не пазбаўляе іх.
Ім ад саміх сябе няма збавення.
На лодцы, дзе раней яна і ѐн
Жылі спакойна, звіў гняздо трохкутнік [2, с. 295].

Іншымі словамі, у паэме «Цунамі» А. Куляшоў даводзіць, што героі існуюць у свеце, дзе ўжо не схавацца ад інфармацыйнага і тэхналагічнага гвалту. Маючы элементы рабінзанады, твор, відавочна, утрымлівае ідэі антыўтопіі, прычым напісаны ѐн да –афіцыйнага‖ прызнання літаратуразнаўцамі гэтага жанру.

А. Адамовіча заўсѐды цікавілі праблемы міжнацыянальнага значэння, і найважнейшымі з іх пісьменнік лічыў Другую сусветную вайну, Чарнобыльскую трагедыю, небяспеку ядзернай катастрофы і інш. А таму з‘яўленне аповесці «Апошняя пастараль» заканамернае ў яго творчасці. Гэта наяўны прыклад судакранання з сусветнай літаратурнай антыўтопіяй. Калі ў адносінах да «Цунамі» А. Куляшова мы можам гаварыць толькі аб элементах гэтага жанру, то аповесць «Апошняя пастараль» раскрывае ўвесь свой патэнцыял сродкамі антыўтопіі ў сумежнасці з рабінзанадай.

Сюжэт твора заснаваны на праблеме небяспекі ўзнікнення ядзернай вайны, і гэта абумоўлівае ўвядзенне пісьменнікам фантастычнага элемента ў твор. Іншымі словамі, аповесць «Апошняя пастараль» можна далучыць да «атамнай утопіі», якая ў гісторыі літаратуры прадстаўлена шматлікімі тэкстамі, якія перасцерагалі чалавецтва да здарэння на Хірасіме, а ў другой палове XX ст. падобная тэматыка стала яшчэ больш актуальнай.

Рысы рабінзанады ў «Апошняй пастаралі» выкарыстоўваюцца ў мадыфікаванай форме, і большы акцэнт набываюць прыкметы антыўтопіі і постапакаліптыкі. Тым не менш па сюжэце твора мы бачым купку ізаляваных персанажаў: на выпаленай радыяцыяй зямлі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

застаюцца ўсяго тры чалавекі, жывуць яны на незаселеным востраве, не забруджаным радыенуклідамі. Акрамя таго, у творы заўважаецца і прыпавесційнасць аповеду: героям трэба выжыць не толькі для свайго выратавання, а для працягу чалавечага роду. Прытчавасць падкрэсліваецца і абагульнена-абстрактнымі імѐнамі герояў – Ён, Яна, Трэці.

У свой час антыўтопія з'явілася для таго, каб паказаць людзям, да якіх вынікаў могуць давесці іх неабдуманыя дзеянні, і перасцерагчы ад такога сцэнару ў рэальнасці. «Апошняя пастараль» дае страшнае ўяўленне пра будучыню, адмаўляючы ад традыцыйнай шчаслівай развязкі сюжэтнай схемы рабінзанады. «Не знаю, что и как Она, но я вот что чувствую: мне последнему дано! Может быть, последнее, и ничего этого уже никогда не будет!» [3, с. 507] – красамоўна выказваецца герой «Апошняй пастаралі».

Такім чынам, паэма «Цунамі» А. Куляшова і аповесць «Апошняя пастараль» А. Адамовіча з'яўляюцца ўзорамі антыўтопіі, што абумоўлівае ўвядзенне пісьменнікамі ў тэкст фантастычных элементаў. Тут уздымаюцца праблемы наступстваў тэхнічнага прагрэсу, якія вырашаюцца ў традыцыйнай для літаратуры перасцярогі форме. У паэме «Цунамі» аўтар паказве двух закаханых у свеце, у якім ужо не схавацца ад інфармацыйнага і тэхналагічнага гвалту, а ў «Апошняй пастаралі» А. Адамовіча, у свеце якой ядзерная вайна выкасіла ўсѐ жывое, галоўнай задачай герояў выступае выратаванне самога чалавецтва, што сведчыць пра наяўнасць прыкмет апакаліптыкі і прыпавесці. Разам з тым сюжэтная мадэль абодвух твораў мае выразныя рысы рабінзанады, што надае творам арыгінальнае гучанне.

**Спіс літаратуры**

1 Ружевич, Т. Н. Робінзонівське суголосся з природою. Всесвітня література в середніх навчальних закладах України, №10 / Т. Н. Ружевич. – Киев: Центр учбової літератури, 2014. – 184 с.

2 Куляшоў, А. Збор твораў: у 5 т. / А. Куляшоў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972–1981. – Т. 2: Паэмы. – 1975. – 303 с.

3 Адамович, А. Повести / А. Адамович. – М.: Советский писатель, 1989. – 637 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ